Гэта мая вёска, мой край, мая зямля!

Швед Вераніка
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Махнавіцкая сярэдняя школа Мазырскага раёна"
5 клас

Радзіма ... Родны кут… Самае прыгожае і мілае месца на зямлі… Як часта я чую гэтыя словы з вуснаў дарагіх мне людзей, гэта тыя словы, якія прымушаюць трапятаць маё сэрца. Пачуццё любові да Радзімы прывіваецца чалавеку з маленства, найперш у сям'і, а затым і ў школе. Але па-сапраўднаму адчуць усю сілу магічнай сувязі паміж чалавекам і Радзімай можна толькі тады, калі ты жывеш там, дзе нарадзіўся. Што можа быць лепш таго куточка, дзе ўсё табе так знаёма і блізка: кожны лісцік, кожны кусцік, кожная сцежачка… Я лічу, што чалавеку неабходна з дня ўдзень адчуваць і разумець непаўторнасць тых мясцін, дзе ён зрабіў свае першыя крокі, дзе вымавіў першае слова, дзе ўпершыню адчуў водар той зямлі, якая называецца малой Радзімай! Маёй малой Радзімай з'яўляецца маленькая вёсачка, якая раскінулася ў самай глыбінцы Палесся. Гэта – вёска Буда-Сафіеўка! Гэта тое месца, дзе ўсё здаецца асаблівым і родным, дзе жывуць любыя мне людзі і блізкія сябры.

Буда-Сафіеўка – гэта звычайная вёска, але яна так прываблівае да сябе сваёй прыгажосцю, сваёй прастатой, сваімі ветлівымі жыхарамі. З усіх бакоў яе акружае лес, багаты дзічынай, грыбамі, ягадамі; прыгожымі мясцінамі для летняга адпачынку. Грыбы-баравікі тут так і просяцца ў кошыкі! А калі глянуць пад ногі, можна ўбачыць смачныя і духмяныя сунічкі. Здаецца, што спецыяльна для цябе лес падрыхтаваў столькі пачастункаў! А якое тут чыстае і свежае паветра! Першым сваіх гасцей сустракае гаспадар лесу – цар-дуб, які ўзвышаецца ўгору над іншымі дрэвамі. Яго велічэзныя галіны, як бацькоўскія рукі, абдымаюць дрэвы, якія стаяць побач з ім. Жыхары вёскі ганарацца сваімі прыгожымі лясамі з багатым звярыным светам. Ніхто і ніколі не крыўдзіць лясное насельніцтва.

За вёскай знаходзіцца па-сапраўднаму маляўнічы луг, на якім растуць прывабныя кветкі і лекавыя травы, якія так любяць збіраць нашы бабулькі для гаючых мэт. А непадалёку размешчана возера, у якім чыстая і празрыстая вада. Улетку тут заўсёды збіраецца вялікая колькасць людзей, як дарослых рыбакоў, так і дзяцей, якія прыходзяць сюды паплюхацца ў спякоту ў прахалоднай вадзе. Летам я таксама бываю частай госцяй на возеры, вельмі люблю паляжаць на беразе, паглядзець у чыстае сіняе неба і памарыць.

А якія ў нас добрыя, усмешлівыя і спагадлівыя людзі! Яны заўсёды імкнуцца зрабіць сваю маленькую Радзіму прыгожай і зручнай для жыцця. Кожны жыхар клапоціцца аб парадку не толькі ў сваім двары, але і за яго межамі. Я лічу, што самае каштоўнае ў маёй вёсцы – гэта людзі. Бо толькі чалавек можа стварыць усю прыгажосць і зрабіць вёску тым незвычайным месцам, дзе хочацца жыць і працаваць на славу сваёй роднай зямлі.

У нашай вёсцы ёсць слаўная традыцыя: 9 мая і 3 ліпеня на стадыёне

праводзіць раённыя спаборніцтвы па футболу. У гэтыя дні ў вёсцы заўсёды мнагалюдна, тут збіраецца ўвесь наш Лельчыцкі раён, каб не толькі падтрымаць  каманды спартсменаў, але і павесяліцца ў такія святочныя і важныя дні для нашай роднай краіны.

Мне ў маёй вёсцы падабаецца ўсё: і брэх сабак, і кудахтанне нясушак, і рыканне кароў, якія вяртаюцца з пашы, і гогат гусей… Але шкада, што з кожным годам вуліцы  вёскі радзеюць, пусцеюць дамы. Старэюць, паміраюць пажылыя людзі, а моладзь не спяшаецца засяляць бацькоўскія гнёзды. Яна пацягнулася ў горад, з’язджаючы цэлымі сем’ямі. Жыць ды жыць бы вёсцы – развівацца, але прыйшлі іншыя часіны. Закрыліся спачатку школа, сельскі клуб, потым і паштовае аддзяленне. Вось і мне прыходзіцца ездзіць у школу ў іншую вёску. З болем у сэрцы разумею, што аднойчы знікне з карты нашай Радзімы мая родная вёска Буда-Сафіеўка.

Мне хочацца, каб мая вёска была самай чыстай, квітнеючай і ўтульнай. А для гэтага мы павінны любіць і берагчы не толькі сябе, але і ўсё, што нас акружае. Мы, падрастаючае пакаленне, павінны рабіць усё, каб маленькая Радзіма не толькі квітнела, але, галоўнае, ніколі не знікла з карты Беларусі.

Я люблю сваю вёсачку, таму што менавіта тут на дахах драўляных дамоў затрымліваюцца прамяні заходзячага сонца, павольна слізгаючы па казырках і карнізах. Менавіта ў маю вёску спяшаецца світанак, бо яго так самааддана клічуць пеўні. Толькі тут так бурна кіпіць простае вясковае жыццё…

Я ўдзячна сваёй малой Радзіме за тое, што яна дала мне карані, крылы і сэрца. Я нарадзілася тут і пражыву тут усё жыццё, прыносячы карысць сваёй краіне, сваім людзям! А яшчэ для мяне вельмі важна ведаць і памятаць карані маіх продкаў, культуру роднага краю, яго гісторыю, а затым перадаць яе наступным пакаленням.

Калі заходзіць сонца далёка за гарызонт, загараюцца агні ў вокнах дамоў, хочацца глыбока ўздыхнуць і яшчэ раз сказаць: “Люблю цябе, мая родная, мая непаўторная вёсачка Буда-Сафіеўка!”